

THE NEW 52!

BATMAN

10 $3.99 US

SCOTT SNYDER
GREG CAPULLO
JONATHAN GLAPION



DIRECT SALES
RATED T TEEN
AUG 2012
7 61941 30640 7 01011

BY COMICS

БЭТМЭН
#10 (2011)
ПЕРАКЛАД:
COMICSBY

ВАШ ПОЗІРК НАКІРАВАНЫ НА САМУЮ ДАРАГУЮ ПРЫВАТНУЮ РЭЗІДЭНЦЫЮ ГОТЭМА.

КОМПЛЕКС КОШТАМ У 58 МІЛЬЁНАЎ ДАЛЯРАЎ ЗАЙМАЕ ТРЫ ВЕРХНІЯ ПАВЕРХІ ЗНАКАМІТАГА «ГАТЭЛЯ ПАУЭРС». А ЖЫВЕ Ў ІМ СТАРЭЙШЫНА СЯМ'І ПАУЭРСАЎ, ДЖОЗЭФ, І ЯГО ЖАНА МАРЫЯ.

ГЭТАЕ МЕСЦА БЫЛО ПАБУДАВАНА Ў ЧАСЫ ВЯЛІКАЙ ДЭПРЭСІІ, ЯК КРЭПАСЦЬ, ЯКАЯ СТРЫМЛІВАЛА НАРОД. ТУТ ЁСЦЬ СВОЙ СПАРТЫЎНЫ ЗАЛ, БІЛЬЯРД, КЕГЕЛЬБАН, А НА ГАЎБЕЦУ – НАВАТ МЕСЦА ДЛЯ ПРЫЗЯМЛЕННЯ ДЫРЫЖАБЛЯ.

ГЭТЫ ДОМ, ЯКІ ЗНАХОДЗІЦЦА ПАД АХОВАЙ СЛУЖБОЎЦАЎ ГАТЭЛЯ І ПРЫВАТНЫХ АХОЎНІКАЎ, БЕСПРАВАДНОЙ АХОЎНАЙ СІСТЭМАЙ, НІКОЛІ НЕ БАЧЫЎ НЯПРОШАНЫХ ГОСЦЯЎ.

ДА ГЭТАГА ВЕЧАРА.

БОЖА МОЙ...

АХОВА!

Я СКАЗАЛА АХОВА! НА ДАПАМОГУ...

ПЕРАКЛАД
НА БЕЛАРУСКУЮ
COMICSBY.BY

атака на суд

УЖО ЎХОДЗІЦЕ?

SCOTT SNYDER
writer

GREG CAPULLO
penciller

JONATHAN GLAPION
inker

FCO
PLASCENCIA
colorist

RICHARD STARKINGS
and COMICRAFT'S
JIMMY B · lettering

KATIE KUBERT
assistant editor

MIKE MARTS
editor

CAPULLO and
PLASCENCIA
cover

RAFAEL
ALBUQUERQUE
variant cover

BATMAN
created by
BOB KANE


ВЫ... ВАМ НЕЛЬГА БЫЦЬ ТУТ. Я ПАКЛІ-КАЮ...
ЯНА... ЯНА НЕ ДЖО-ЗЭФА.


ВЕДАЮ, МІСІС ПАУЭРС.
ЯНА ВАША. Я ЗНАЙШОЎ СКРЫНЮ З-ПАД МАСКІ ВАША-ГА МУЖА, АЛЕ ЯНА ПУСТАЯ.
ДЗЕ Ж ЁН?


УЕХАЎ. ПАКІНУЎ КРАІНУ.
А ТЫ І ТВАЕ СЯБРЫ... ЛІЧЫЦЕ, ШТО ПЕРААДОЛЕЛІ НА ГЭТЫ РАЗ, АЛЕ ГЭТА НЕ ТАК!
ВАМ НЕ ПЕРАМАГЧЫ! І... І КАБ Я БЫЛА НА ТВАІМ МЕСЦЫ, ТО ПАКІНУЛА Б ГЭТЫ ГОРАД І НЕ ВЯРТАЛАСЯ.
А НА ВАШЫМ МЕСЦЫ...
...Я Б АБВЫКАЎ ДА ВЫГЛЯДУ СКРОЗЬ РА-ШОТКУ.

ВАША ТАКТЫКА ЗАПУГВАННЯ ПАДЗЕЙ-НІЧАЛА, СЭР. УЖО ЗАРАЗ ЯНА ТЭЛЕФАНУЕ СВАЙМУ МУЖУ.
АЛЬФРЭД, СКАЖЫ, ШТО МОЖАШ ПРА-САЧЫЦЬ ЗА СІГНАЛАМ.
ЗДАЕЦЦА, ТАК. АЛЕ СТУЖКА ЗАШЫФРАВАНА, АДНАК ДЗЯ-КУЮЧЫ ЯГО ЖАНЕ МЫ МОЖАМ ЗНАЙСЦІ МЕСЦА, ДЗЕ ЗНА-ХОДЗІЦЦА ЯГО ТЭЛЕФОН.
А ШТО З КІПЦЮРАМІ?
CRYO
Я ЗМЯСЦІЎ ІХ У ХАЛАДЗІЛЬНІК У ЛАБАРАТОРЫІ, СЭР...
...І, ВІДАЦЬ, ЯНЫ ПЕРАХОДЗЯЦЬ Ў НЕЙКІ ЗАКАНСЕР-ВІРАВАНЫ СТАН.
ДОБРА.
ПАКЛІЧ МЯНЕ, КАЛІ ЗНОЙДЗЕШ МІСТАРА ПАУЭРАСА.

ГЭТА ВЕЛЬМІ ДЗІЎНА, СЭР...
...ТЭЛЕФОН ЗНАХОДЗІЦЦА Ў НЕЙКАЙ ЗАГЛУШАНАЙ ЗОНЕ.
ЗАГЛУШАНАЯ ЗОНА?
НЕХТА СТВАРЫЎ МЁРТВУЮ ЗОНУ РАДЫУСАМ ПРЫКЛАДНА З ЧВЭРЦЬ МІЛІ. Я МАГУ ПРАСАЧЫЦЬ ТЭЛЕФОН ДА МЕЖ ГЭТАЙ ЗОНЫ, АЛЕ ДАЛЕЙ...
ДЗЕ Ж ЯНА?
...ЯНА ЗНАХОДЗІЦЦА НА ПОЎДНІ ГОТЭМА, СЭР.
УЗДОЎЖ ВУЛІЦЫ?
ТАК, І МЯРКУЮЧЫ ПА ВЫПРАМЕНЬВАННІ, Я ВЫЛІЧЫЎ, ШТО ЭПІЦЭНТР ЗНАХОДЗІЦЦА ДЗЕСЬЦІ КАЛЯ...
ІРВІНГТОН...
...ПРАБАЧЦЕ?
ІРВІНГТОН, 77. ТАМ, ДЗЕ ЗАЎСЁДЫ І БЫЛО.
ТАК, АЛЕ ЯК ВЫ ДАВЕДАЛІСЯ, СЭР?
МАЙСТАР БРУС?

ГЕНРЫ ДЬЮКАРД, ВЯЛІКІ ДЭТЭКТЫЎ, АДНОЙЧЫ СКАЗАЎ МНЕ, ШТО ІСНУЕ ТАКОЕ ПАЧУЦЦЁ, ЯКОЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ТОЛЬКІ Ў НЕКАТОРЫХ ВЫПАДКАХ...

КАЛІ ЛІНКАЛЬН МАРЧ ДАЎ МНЕ КАРОТКІ СПІС ІМЁН, У МЯНЕ ЎЗНІКЛА ГЭТА ПАЧУЦЦЁ. Я ЎБАЧЫЎ ІМЯ ДЖОЗЭФА ПАЎЭРСА Ў СПІСЕ І ЗРАЗУМЕЎ.

НЕ ТАМУ, ШТО ЁН ПАБУДАВАЎ ГОТЭМСКІ ПТАШНІК, НЕ З-ЗА КАЛЕКЦЫІ РЭДКІХ СОЎ. І НЕ ТАМУ, ШТО ЯГО ФІНАНСЫ ВЫГЛЯДАЮЦЬ ПАДАЗРОНА. А ТАМУ, ШТО Я ПЯЧОНКАЙ АДЧУЎ ГЭТЫ ЎСПАМІН.

І ЗАРАЗ Я ІЗНОЎ АДЧУВАЮ ГЭТА...

...КАЛІ ЎСЕ ДЭТАЛІ НЕЧАКАНА АКАЗВАЮЦЦА НА НАЛЕЖНЫМ МЕСЦЫ, І АДКАЗ, ЯКІ ВЫ ШУКАЛІ ДОЎГІ ЧАС, РАПТАМ ПРЫХОДЗІЦЬ У ГАЛАВУ.

ЯК КАЗАЎ ДЬЮКАРД, ГЭТА ПАЧУЦЦЁ ПАДОБНА НА «ПАМЯЦЬ». НЕ СТОЛЬКІ ВЫКРЫЦЦЁ НЕЧАГА НОВАГА, КОЛЬКІ ЎЗНАЎЛЕННЕ Ў ПАМЯЦІ ТАГО, ПРА ШТО ДАЎНА ВЕДАЎ. ТАГО, ШТО ЛЯЖЫЦЬ НАЎПРОСТ ПЕРАД ВАМІ.

«ГЭТА ПАЧУЦЦЁ – ЛЕПШЫ ЗНАК ТАГО, ШТО Ў ЦЯБЕ ЁСЦЬ АДКАЗ», – СКАЗАЎ ДЬЮКАРД.

...ЗНАХОДЗЯЧЫ-СЯ КАЛЯ ГЭТАГА БУДЫНКА.

Я ПРЫХОДЗІЎ У ПАРТОВЫ ДОМ, КАЛІ БЫЎ ХЛОП-ЧЫКАМ. Я ШУКАЎ САВІНЫ СУД.

ТАДЫ Я НІЧОГА НЕ ЗНАЙШОЎ.

СЁННЯ – ІНШАЯ СПРАВА.



СЁННЯ СУД БУДЗЕ ПАКАРАНЫ. АДНОЙЧЫ І НАЗАЎЖДЫ.


НІЯКІХ СХОВІШЧАЎ. НІЯКІХ ЗМОЎ З ЦЯНЕЙ.


СЁННЯ ІХ ГІСТОРЫЯ СКОНЧЫЦЦА. ІХ КАРОТКАЯ ПЕСНЯ БУДЗЕ ПРАСПЯВАТА. ІХ ІМЁНЫ ЗНІКНУЦЬ З ГІСТОРЫІ ГОТЭМА.
ЯНЫ ТАКСАМА ВЕДАЮЦЬ ГЭТА. СПЯШАЮЦЦА СУСТРЭЦЦА ТУТ СЯРОД НАЧЫ.
АЛЬФРЭД ПАВЕДАМІЎ, ШТО БОЛЬШАЯ ЧАСТКА ЗАМАХАЎ БЫЛА НЯЎДАЛАЙ. БОЛЬШАЯ ЧАСТКА КІПЦЮРОЎ ЗРЫНУТА.


І ЦЯПЕР Я ЗАГНАЎ ІХ У КУТ.
НІ АХОВЫ, НІ ПАСТАК... НІЧОГА, ШТО МАГЛО Б МЯНЕ СТРЫМАЦЬ.



НЕ СЁННЯ.
НЕ...







ХАЛЕРА ВАС БЯРЫ...


«...УСІХ ВАС».




МАЙСТАР БРУС?


ВЫ НЕ АПРАНУЛІСЯ. НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ, ШТО ПРАЗ ГАДЗІНУ Ў ВАС СУСТРЭЧА З ФІРМАМІ, ЯКІЯ ПРАПАНУЮЦЬ КОШТ НА ПАДЗЕМНЫ ПАРК.
Я Ж КАЗАЎ, ШТО ЧАКАЮ СВОЙ ШЭРЫ ГАРНІТУР, АЛЬФРЭД.


ВІДАЦЬ, ЁН ПАДКРАЎСЯ ДА ВАС НЕЗАЎВАЖНА, СЭР.


ДЫК ЧАМУ Б ВАМ НЕ АДДАЦЬ МНЕ ГЭТЫЯ ШТУКІ, КАБ Я ВЯРНУЎ ІХ У СКРЫНКУ, А ВЫ МАГЛІ Б ПАДУМАЦЬ ПРА ДРЭВЫ І САЖАЛКІ, ЭКАЛОГІЮ ГОРАДА.


ГЭТА БЕССЭН-СОЎНА, АЛЬФРЭД. НАВОШТА СЯБРАМ СУДА ПАКОНЧЫЦЬ З САБОЙ ПРОСТА ТАК?



ДУМАЮ, ТАК ЯНО І БЫЛО. ВЫ АДБІЛІ ГОРАД У ІХ.
АЛЕ ЁСЦЬ ЯШЧЭ І ГРОШЫ. ІХ ЗНЯЛІ З РАХУНКАЎ ЗАГІНУЛЫХ УДЗЕЛЬ-НІКАЎ ЗА АПОШНІЯ НЕКАЛЬКІ ТЫДНЯЎ... БОЛЬШ ПАДОБНА НА ЗМОВУ. НЕЙКІ ВЫКРУТ.
ВЫ БАЧЫЛІ ВЫНІКІ ВЫКРЫЦЦЯ. ЯНЫ АБСАЛЮТНА МЁРТВЫЯ.



НЕШТА НЕ ЗЫХОДЗІЦЦА, АЛЬФРЭД. НЕШТА ЗА ЎСІМ ГЭТЫМ ЁСЦЬ. Я ГЭТА АДЧУВАЮ. НЕХТА БЫЎ НАВОКАЛ. УВЕСЬ ГЭТЫ ЧАС.


МАГЧЫМА І ТАК, СЭР. АДНАК АДКАЗЫ ПРЫЙДУЦЬ. ВЫ ВЕДАЕЦЕ АСОБЫ ПА МЕНШАЙ МЕРЫ НЕКАЛЬКІХ ЛІДЭРАЎ САВІНАГА СУДА.
І ХОЦЬ ІХ АДГАНІЗАЦЫЯ, ЯК ВЫ ВЫСВЕТЛІЛІ, ЗНАЧНА БОЛЬШ, ЧЫМ АДНА СУПОЛКА, Я ЎПЭЎНЕНЫ, У РЭШЦЕ РЭШТ ВЫ ПРЫЦЯГНЕЦЕ ЎСІХ ІХ ДА АДКАЗНАСЦІ.
КАЛІ СУМЛЕННА КАЗАЦЬ, СЭР, МАГЧЫМА, У ГЭТАЙ КАНЦОЎЦЫ НЕ ЗЫХОДЗІЦЦА ТОЛЬКІ ТОЕ, ШТО ГЭТА І ЁСЦЬ КАНЕЦ.
ВЕДАЮ, КАЛІ ВЫ БЫЛІ ХЛОПЧЫКАМ, ВЫ ДУМАЛІ, ШТО МОЖАЦЕ ЗНАЙСЦІ АДКАЗЫ ДАТЫЧАЛЬНА ЗАБОЙСТВА ВАШЫХ БАЦЬКОЎ У САВІНАГА СУДА, І, ЗДАГАД-ВАЮСЯ, ВЫ СПАДЗЯВАЛІСЯ АТРЫМАЦЬ БОЛЬШ АДКАЗАЎ ЗАРАЗ.


ЧАМУ ТЫ ТАК ВЫРА-ШЫЎ?


КАЛІ НАДЫЙДЗЕ ІХ ЧАРГА? ІХ ЗАБОЙСТВ? ВЫ І ЁСЦЬ АДКАЗ НА ГЭТУЮ ЗАГАДКУ, БРУС УЭЙН. І ГЭТАГА АДКАЗА...
...ДАСТАТКОВА.


А ЗАРАЗ АПРАНАЙЦЕ СВОЙ ХРЭНАЎ ГАРНІТУР І ПРАВАЛЬВАЙЦЕ АДСЮЛЬ.
ДОБРА, ДОБРА. УЖО ЎХАЖУ.


ТОЛЬКІ ПАТЭЛЕФАНУЙ РОБЕРТСУ І СКАЖЫ...



СКАЖЫ ЯМУ...
ШТО СКАЗАЦЬ, СЭР?


СКАЖЫ ЯМУ...


...Я НЕ ЗМАГУ ГЭТА ЗРАБІЦЬ.
АЛЕ, СЭР, КУДЫ ВЫ...
Я ІДУ ЗА ІМ, АЛЬФРЭД.


«ЗА КІМ,
МАЙСТАР БРУС?»


«СЭР? ...ЗА КІМ?»
«ЗА ІМ.
АДКАЗАМ
НА ЎСЁ».


«ЗА ТЫМ, ХТО СТАІЦЬ
ЗА ЎСІМ ГЭТЫМ.
КАГО Я ЗАБЫЎ».




Спусціліся
за мной у
Трусіную нару?


ПРАМА
ЗА ТАБОЙ,
ПРЫЯЦЕЛЬ.


ПРАВАЛЫ ГРУНТА – ПАДСТУПНЫЯ ШТУКІ. ЯНЫ СТВАРАЮЦЦА Ў БОЛЬШАЙ КОЛЬКАСЦІ МЕСЦАЎ, ЧЫМ ДУМАЮЦЬ ЛЮДЗІ.
У ГАРАДАХ ЯНА ЎТВАРАЮЦЦА ЗНАЧНА ХУТЧЭЙ ЧАСЦЯКОМ З-ЗА ДЗІРАВЫХ ТРУБ І ЗАНАДТА ЦЯЖКІХ КАНСТРУКЦЫЙ.
У ГОТЭМЕ ЁСЦЬ АДЗІН. ТОЛЬКІ АДЗІН. У АКРУЗЕ КЕЙН.

І ЁН ПРАМА ПАД ГЭТЫМ МЕСЦАМ.

ВІЛВУДСКІ ДЗІЦЯЧЫ ДОМ.

КАЛІСЬЦІ ТУТ БЫЛА ЎСКРАЙКАВАЯ ЛЯКАРНЯ ГОТЭМА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ, ЯКІЯ ХВАРЭЛІ НА ПСІХІЧНЫЯ ЗАХВОРВАННІ І НЕРВОВЫЯ ЗАСМУЧЭННІ.
СМЕРЦЬ



ЯНА ПРАЦАВАЛА ДАТУЛЬ, ПАКУЛЬ 18 ГАДОЎ НАЗАД ПРАВАЛ ГРУНТА НЕ ПРАГЛЫНУЎ ЖЫЛЁВЫЯ ПАМЯШКАННІ ТУТЭЙШАГА ПЕРСАНАЛА.
ПАСЛЯ КАТАСТРОФЫ ЛЮДЗІ ДАВЕДАЛІСЯ ПРАЎДУ ПРА ВІЛВУД.


ДЗЕЦІ ПАДВЯРГАЛІСЯ ЖОРСТКАМУ СТАЎЛЕННЮ. ІМІ ГРЭБАВАЛІ. ДЗЕЦЬМІ. САМОТНЫМІ, НАПАЎГОЛЫМІ, ГНІЛЫМІ Ў БРУДЗЕ. ІХ ПАКІНУЛІ ЗАГІНАЦЬ АД ГОЛАДУ.
ЗАРАЗ ГЭТА МЕСЦА ЗАКІНУТА, І ДЗЕЦІ СПРАБУЮЦЬ ВЫПРАБАВАЦЬ СВАЮ АДВАГУ НАЧНЫМ НАВЕДВАННЕМ У ГЭТЫМ МЕСЦЫ.


КАЖУЦЬ, ШТО НЯШЧАСЦЕ ЗНІКЛЫХ ДЗЯЦЕЙ ВЫКЛІКАЛА ПРАВАЛ ГРУНТА. ШТО Ў ГЭТЫМ МЕСЦЫ НАСЯЛЯЮЦЬ ІХ ДУШЫ.


ГЭТАЙ НОЧЧУ Я АМАЛЬ ПАВЕРЫЎ У ГЭТА... У РЭШЦЕ, Я ТУТ, КАБ ЗЛАВІЦЬ МЯРЦВЯКА.


Я ТУТ.



УНХ!

ІТАК, СКАЖЫ МНЕ, БЭТМЭН...
ХТО?

ХТО Я ТАКІ?

НЕ ВЕДАЮ, АЛЕ ДАКЛАДНА НЕ ЛІНКАЛЬН МАРЧ. ТАМУ ШТО ТАКОГА ЧАЛАВЕКА НЕ ІСНУЕ.
ЁН ІСНУЕ ТОЛЬКІ НА ПАПЕРАХ САВІНАГА СУДА.

ДОБРА, КАЛІ Я НЕ ЛІНКАЛЬН МАРЧ, ТАДЫ ХТО Ж Я?


ТЫ ЗДРАДНІК І ЗЛОДЗЕЙ. ТЫ БЫЎ УДЗЕЛЬНІКАМ СУДА, АЛЕ ЗДРАДЗІЎ ІМ. КАЛІ НА ІХ УСЁ АБРЫНУЛАСЯ.
ТЫ ЗАБРАЎ ГРОШЫ Ў ЛІДАРАЎ, КАЛІ ЗАПРАСІЎ ІХ НА ВАЖНУЮ НАРАДУ І АТРУЦІЎ. А ПОТЫМ АБСТАВІЎ УСЁ ТАК, БЫЦЦАМ ЯНЫ ЗАБІЛІ СЯБЕ САМІ.
МІЖ ІНШЫМ, ТЫ ЗАПІСАЎ СВАЁ ІМЯ Ў СПІС АХВЯР, ДАЧАКАЎСЯ, ПАКУЛЬ АДЗІН З КІПЦЮРОЎ ПРЫЙДЗЕ ЗА ТАБОЙ, І ПАКАЗАЎ СВАЮ СМЕРЦЬ...


НЕ ТАК.
НЕ ТАК. ТЫ ПРЫНЯЎ СЫРОВАТКУ ПЕРАД АТАКАЙ. ЗЛУЧЭННЕ, ЯКОЕ ВЯРТАЕ КІПЦЮРОЎ ДА ЖЫЦЦЯ.
СУД ПРЫЙДЗЕ ЗА ТАБОЙ, ЛІНКАЛЬН. ТЫЯ, КАГО ТЫ ЗАБІЎ, БЫЛІ ТОЛЬКІ ПЕШКАМІ Ў...


О, ТАК, ЯНЫ ПРЫЙДУЦЬ ЗА МНОЙ. АЛЕ (ХЕХ) ЗАРАЗ МЯНЕ НЯ ПРОСТА ЗАБІЦЬ.
ВЕДАЕШ, БРУС, БЫЛА РАЗМОВА ПРА НАВУЧАННЕ НОВЫХ КІПЦЮРОЎ. ДА ТАГО, ЯК РАСПРАЦАВАЛІ СЫРОВАТКУ, ЯКАЯ ДАЗВАЛЯЛА АЖЫЎЛЯЦЬ КІПЦЮРОЎ МІНУЛАГА. НАВАТ БЫЎ РАСПРАЦАВАНЫ ГАРНІТУР.
ТРЫВАЛЫ І СУЧАСНЫ. ЯКІ МОГ ЗНІШЧЫЦЬ БЭТМЭНА.
АЛЕ МЫ АДЫШЛІ АД ПЫТАННЯ...
...БО ТЫ КАЖАШ МНЕ, ШТО Я ЗРАБІЎ.
А НЕ ХТО Я.
ДЫК ХТО Ж, БРУС, ХТО? ВЕДАЮ, У ЦЯБЕ ЁСЦЬ ТЭОРЫЯ.


МАЯ ТЭОРЫЯ? ТЫ ТУТ КАЛІСЬЦІ БЫЎ ПАЦЫЕНТАМ.
ВЫДАТНА.
СКАЖЫ, ЯК ТЫ ЗДАГАДАЎСЯ?
SNIP
ЛЮДЗІ НАКШТАЛТ ЦЯБЕ, ЗЛАЧЫНЦЫ, ЗАЎСЁДЫ ПАКІДАЮЦЬ ЗА САБОЙ ДОКАЗЫ.
НЕ ТАМУ, ШТО ВЫ ГЛУПЫЯ, НЕ. А З-ЗА САМАЛЮБСТВА. ВАМ ПАДАБАЕЦЦА ПАДРАЖНІЦЬ ТАГО, ХТО ВАС ПЕРА-СЛЕДУЕ.
ІТАК, ПРАВАЛ ГРУНТА. ТАЯ ГІСТОРЫЯ, ЯКУЮ ТЫ МНЕ РАСКАЗАЎ У ЛЯКАРНІ, ПАСЛЯ ТАГО ВЫПАДКА Ў СТАРОЙ ВЕЖЫ УЭЙНА. ТЫ ПРАПАНАВАЎ ЗАЗІРНУЦЬ У ГЛЫБІНЮ ЦЯБЕ.
ТЫ ВЕДАЎ, ШТО ДА ДАКУ-МЕНТАЎ САВІНАГА СУДА НЕЛЬГА ПРЫДЗЕРЦІСЯ, АЛЕ НАВАТ ТАК ТЫ ПАКІНУЎ ЗАЧЭПКУ.
АБМОЎКА ПА ФРЭЙДУ.
АБМОЎКА ПА ФРЭЙДУ. ТАКСАМА ЯК І З ТАБОЙ. НАПРЫКЛАД, КАЛІ Я ЎБАЧЫЎ, ЯК ТЫ ЗМАГАЕШСЯ З ТЫМ КІПЦЮРОМ ПАД ЧАС НАШАЙ СУСТРЭЧЫ. ТА ПАВІНЕН БЫЎ БЫЦЬ ЛЁГКАЙ МІШЭННЮ.
СУД СКАЗАЎ, ШТО Я МАГУ БЫЦЬ ТАМ І НАЗІРАЦЬ. І КАЛІ Я ЎБАЧЫЎ, ШТО ТЫ... БЭТМЭН... ВОСЬ ТАДЫ Я І ЗРАЗУМЕЎ, ШТО ПАВІНЕН РАБІЦЬ. ЧЫМ Я ПАВІНЕН СТАЦЬ.
АЛЕ ТАКСАМА Я ЎБАЧЫЎ, ШТО ТАКОЕ... СУД. ЯНЫ СКАЗАЛІ, ШТО КІПЦЮР НАПАЎ НА МЯНЕ ВЫПАДКОВА, ПАМЫЛКОВА, АЛЕ Я ЎБАЧЫЎ АБМОЎКУ ПА ФРЭЙДУ.
НУ ДЫК ХТО Я, БРУС? НУ ЖА. Я БЫЎ ПАЦЫЕНТАМ І СУД ЗАБРАЎ МЯНЕ ДА СЯБЕ... ЧАМУ?
ТЫ БЫЎ ТЫМ, У КАГО НЕ БЫЛО НІЧОГА, КАГО ЯНЫ МАГЛІ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ І КАНТРАЛЯВАЦЬ, КАГО МАГЛІ СТВА-РЫЦЬ З САМАГА ПАЧАТКУ. ІХ УЛАСНАГА КАНДЫДАТА. ЛІНКОЛЬНА МАРЧА.
НЕ! З-ЗА ТАГО, КІМ Я ЎЖО БЫЎ! ХТО Я...
ТЫ ЗЛУЕШ МЯНЕ, БРУС, КАЛІ ПАЗБЯГАЕШ ПЫТАННЕ. АЛЕ КАЛІ ТЫ НЕ АДКАЖАШ НА ГЭТАЕ, ВОСЬ ТАБЕ ЯШЧЭ АДНО: ЯК? ЯК У ЦЯБЕ ЎЗНІКЛА ДУМКА? ЧАМУ ТЫ ПАЙШОЎ У МОРГ?
...
АД-КАЖЫ!


БРОШ-
КА.


БРОШКА! ШТО ЗА БРОШКА?


ТАЯ ГІСТОРЫЯ, ЯКУЮ ТЫ РАСКАЗАЎ МНЕ НА ВЕЖЫ. ПРА СМЕРЦЬ ТВАЁЙ МАЦІ, ПРА АЎТАКАТАСТРОФУ, ЯКАЯ ЗАБІЛА ЯЕ.


ГЭТА БЫЛА ХЛУСНЯ, АЛЕ ДЗЕ ПРАЎДА?
ТЫ ЎЗГАДАЎ БРОШКУ, ЯКУЮ ЯНА НАСІЛА. БЯСФОРМАВАЕ СЭРЦАЙКА З ГЛІНЫ.
І ШТО?


«ТЫ ЎБАЧЫЎ ПАРТРЭТ МАЁЙ МАЦІ, ЯКАЯ НАСІЛА ТАКУЮ БРОШКУ, І ВЫКАРЫСТАЎ ГЭТА...»


НЕ. АБМОЎКА ПА ФРЭЙДУ, БРУС. ГЭТА БРОШКА. ТАКІЯ БЫЛІ ТОЛЬКІ Ў МАЦІ ТЫХ ДЗЯЦЕЙ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗІЛІСЯ ТУТ, У ВІЛВУДЗЕ.
ДЫК ХТО Я, БРУС?



ХТО? ЯК ВЯЛІКАЯ САВА, Я ПЫТАЮ, ХТО?!
ТЫ ПСІХ.
НІКЧЭМ-НАСЦЬ. ТЫ...


ТВОЙ БРАТ, БРУС.
Я ТОМАС УЭЙН МАЛОДШЫ.
ТВОЙ БРАТ, ЯКОГА Ў ЦЯБЕ НІКОЛІ НЕ БЫЛО. С АДВА-РОТНАГА БОКУ ЛЮСТЭРКІ.


У МЯНЕ НЯМА БРАТА!


О, АЛЕ ЁН ПАВІНЕН БЫЎ БЫЦЬ, ПАМЯТАЕШ? ВЕДАЮ, ПАМЯТАЕШ. ЎЗГАДАЙ, ШТО ЗДАРЫЛАСЯ. Я БЫЎ ТАМ, У МАМІНЫМ ЖЫВАЦЕ... АЛЕ ЗДАРЫЎСЯ НАШЧАСНЫ ВЫПАДАК, БРУС. ПАМЯТАЕШ?
ТЫ БЫЎ ТАМ. Я НАРАДЗІЎСЯ ЗАЎЧАСНА З ЦЯЖКАСЦЯМІ. І НАШЫЯ БАЦЬКІ СХАВАЛІ МЯНЕ Ў ВІЛВУДЗЕ. КАБ ВЫЛЯЧЫЦЬ ДАЛЕЙ АД СВЕТА.


НЕ ВЕДАЮ, ШТО ТЫ ТАКОЕ КАЖАШ, ЛІНКОЛЬН. ЯКУЮ ГІСТОРЫЮ СУД ЗЛАДЗІЎ ДЛЯ ЦЯБЕ, АЛЕ Ў ГЭТЫМ ІХ ПАМЫЛКА.
МАЕ БАЦЬКІ НЕ ЗРАБІЛІ Б ТАК. ЯНЫ НЕ АДДАЛІ Б СВАЙГО СЫНА Ў ТАКОЕ МЕСЦА, ХВОРЫ ЁН ЦІ НЕ.


ЦІ БАЧЫШ ШТО, ГЭТАЕ МЕСЦА БЫЛО ІНШЫМ ПАД ЧАС НЯШЧАСНАГА ВЫПАДКУ. ТУТ БЫЛА ЛЕПШАЯ ЛЯКАРНЯ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ.
АЛЕ ТОЛЬКІ ДАТУЛЬ, ЯК ФІНАНСАВАННЕ СКОНЧЫЛАСЯ. КАЛІ ГАЛОЎНЫЯ СПОНСАРЫ ЗАГІНУЛІ. ТОМАС І МАРТА УЭЙН. ТРАГІЧНА ЗАСТРЭЛЯНЫ Ў ПРАВУЛКУ.


ТЫ ЖАДАЎ ВЕДАЦЬ, ЦІ МАЕ ДАЧЫНЕННЕ СУД ДА СМЕРЦІ НАШЫХ БАЦЬКОЎ, БРУС. АДКАЗ - НЕ. ЯНЫ НЕ БЫЛЫ ДАТЫЧНЫ. ГЭТА ТВАЯ ВІНА, БРАТ.
І Я ПРЫМУШУ ЦЯБЕ ЗАПЛАЦІЦЬ.
ДЫК СКОНЧВАЙ УЖО РАЗРАЗАЦЬ ГЭТУЮ СЕТКУ. І ДАВАЙ РАЗБЯРЭМСЯ АДНОЙЧЫ І НАЗАЎЖДЫ... ДЗЕЛЯ ГОТЭМА.
УЭЙН НА УЭЙНА.


ТЫ ЗВАР'ЯЦЕЎ.




БРАТ НА БРАТА...


САВА СУПРАЦЬ КАЖАНА!

ЧАС МІНУЎ, СЫНА... АЛЬФРЭД.

КАЛІ Я НЕ СЫЙДУ Ў ХУТКІМ ЧАСЕ, БАЮСЯ, Я ЎЖО НІКОЛІ НЕ ПАКІНУ ГЭТУ ЖАХЛІВУЮ ЗЯМЛЮ.

ЦЕНЬ СМЕРЦІ НАБЛІДАЕЦЦА З КОЖНЫМ ІМГНЕННЕМ.

Я БАЮСЯ ЗА СВАЁ ЖЫЦЦЁ, АЛЕ БОЛЬШ Я ХВАЛЮЮСЯ ЗА ТАЯМНІЧЫ ЖАХ, ЯКОМУ Я ДАЗВОЛІЎ АХАПІЦЬ...

ААХХХ!

...НЕ ТОЛЬКІ НА ЛЕДЗІ МАРТУ І МАЙСТРА ТОМАСА...

...АЛЕ І НА САМЫ НАШЧАДАК СЯМ'І УЭЙНАЎ.

БАЧЫШ ШТО, МАРТА ВЫРАШЫЛА САМА АДЧЫНІЦЬ НОВУЮ ШКОЛУ ДЛЯ БЯЗДОЛЬНЫХ І ЗАБЫТЫХ ДЗЯЦЕЙ ГОТЭМА.



ЯНА ВЕРЫЛА, ШТО З ДАПАМОГАЙ ГЭТАЙ ШКОЛЫ ЗМОЖА СФАРМІРА- ВАЦЬ З ГОРАДА НЕШТА ДОБРАЕ ДЛЯ МАЛАДОГА МАЙСТРА БРУСА...

...І ДЛЯ ДРУГОГА ДЗІЦЯ, ЯКІ ВОСЬ-ВОСЬ ПАВІНЕН БЫЎ НАРАДЗІЦЦА.

НАВАТ У СВАІ ТРЫ ГАДЫ БРУС БЫЎ НЕЗВЫЧАЙНЫМ ХЛОПЧЫКАМ. ДОБРЫМ І РАЗУМНЫМ... Я ВЕДАЮ, АДНОЙЧЫ ТЫ ПАКАХАЕШ ЯГО ТАК САМА, ЯК І Я.

Я ПРАВОДЗІЎ СВАЕ ДНІ, КЛАПОЦЯЧЫСЯ ПА БРУСУ, БО ЯГО МАЦІ БОЛЬШ ДУМАЛА ПРА СВАЕ ПЛАНЫ І СВАЮ ЦЯЖАРНАСЦЬ.

АЛЕ ЗАРАЗ ГЭТАГА НЕ ЗДАРЫЦЦА.

«ДЖАРВІС, КАЛІ ЛАСКА, ПАДЫЙДЗІ СЮДЫ НА ХВІЛІНКУ!»


СЛУХАЮ, МАДАМ?

ЗАБЯРЫ БРУСА І ПАДРЫХТУЙ ЯГО ДА СНА. Я ПАДЫМУСЯ АДРАЗУ, ЯК ДАРАЗМАЎЛЯЮ.

ПРАБАЧЦЕ, МІСТАР МЭР, Я... НЕ... Я ПРАШУ ВЫБАЧЫННЯ, СЭР! ГЭТЫЯ ЛЮДЗІ СКАЗАЛІ, ШТО ЯНЫ АД УЛАД ГОРАДА. ХТО, ХАЛЕРА БЯРЫ, ЯШЧЭ...

ВАМ НЕ ПАДАБАЕЦЦА МОЙ ТОН?!





У ТАКІХ ГАРАДАХ, ЯК ГОТЭМ, ЗАЎСЁДЫ ЗНАЙДУЦЦА ТЫЯ, ХТО ЦВЯРОЗА СТАНУЦЬ СУПРАЦЬ ПРАГРЭСУ.

SMASH

УСЁ ЖЫЦЦЁ Я ЧУЎ ПЛЁТКІ І НЕБЯСПЕЧНЫЯ ЗАБАБОНЫ ПРА ТАКІХ ЛЮДЗЕЙ.

МОЙ БАЦЬКА АДНОЙЧЫ СКАЗАЎ МНЕ, НІКОЛІ НЕ ПАДШТУРХОЎВАЦЬ УЭЙНАЎ ДА ВЕЛІЧУ. ШЧАСЦЕ – БОЛЬШ ГОДНАЯ МЭТА.

І НАЙМЕНШ НЕБЯСПЕЧНАЯ.

Я НІКОЛІ НЕ ПРЫМАЎ ГЭТЫ НАТАТАК СУР'ЁЗНА, ПАКУЛЬ НЕ ПАДСЛУХАЎ ТУЮ ФАТАЛЬНУЮ РАЗМОВУ.



АСАБНЯК УЭЙНАЎ. ДЖАРВІС СЛУХАЕ. ЦІ МАГУ Я ВАМ ДАПАМАГЦІ?

А, МІСТАР ДЖАРВІС ПЕНІВОРТ, ВЫ ТА МНЕ І ПАТРЭБНЫ. ВЫ ПАВІННЫ ЎВАЖЛІВА СЛУХАЦЬ МЯНЕ.

КАЛІ ВЫ Ў НАСТУПНЫ РАЗ ПАВЯЗЕЦЕ МІСІС УЭЙН У ГОРАД, ВЫ ПРЫВЯЗЕЦЕ ЯЕ Ў СЯМНАЦЦАТЫ ДОК НА ПРЫСТАНІ ДЛЯ СЯБРОЎСКАЙ РАЗМОВЫ.








«МАДАМ, Я ТОЛЬКІ ШТО АТРЫМАЎ ЗВАНОК З ПАГРОЗАМІ».


УРВІЦЕЛІ МЭРА ЎСЁ ЯШЧЭ ХОЧУЦЬ ЗАПУЖАЦЬ МЯНЕ, ТАК? ДУМАЮ, ЯНЫ ЗРАЗУМЕЮЦЬ, ШТО ГЭТА ЗРАБІЦЬ БУДЗЕ ЦЯЖКА.
У МЯНЕ ЁСЦЬ ПАДАЗРОНЫ, ШТО ЗА ГЭТЫМ СТАІЦЬ НЕШТА БОЛЬШАЕ, ЧЫМ МЭР. ЯНЫ ХОЧУЦЬ, КАБ Я АДВЁЗ ВАС У НЕЙКІЯ ДОКІ...

НУ, СПАДЗЯ-ЮСЯ, МЫ ТУДЫ НЕ ПАЕДЗЕМ, ТАК?
НЕ, КАНЕШНЕ, НЕ, МАДАМ.

АДНАК У ВАШЫМ СТАНЕ Я ЎСЁ ЯШЧЭ ПАТРАБУЮ...

ДЖАРВІС. У СТАНЕ Я ЦІ НЕ, МЯНЕ НЕ ЗАПУЖАЦЬ У МАІМ УЛАСНЫМ ГОРАДЗЕ. А ЗАРАЗ ПАДРЫХТУЙ МАШЫНУ. Я АБЯЦАЛА БРУСУ, ШТО ПАКАЖУ ЗЯМЛЮ ДЛЯ НОВАЙ ШКОЛЫ.
Я НЕ БАЮСЯ, МАТУЛЯ!

ТЫ САМЫ АДВАЖНЫ ХЛОП-ЧЫК У ГОТЭМЕ, БРУС. І ЗАЎСЁДЫ ІМ БУДЗЕШ.

НАДЗЕЯ МАРТЫ І НЕКРАНАЛЬНАСЦЬ ЯЕ ДУХА ПРЫМУСІЛІ МЯНЕ ЗГАДЗІЦЦА. АЛЕ Ў ГЛЫБІНІ СЭРЦА Я ВЕДАЎ, ШТО ПАВІНЕН БЫЎ НАСТАЯЦЬ НА ТЫМ, КАБ ЗАСТАЦЦА ДОМА.

У МЯНЕ, ЯК І ЗАРАЗ, БЫЛІ ПАДАЗРОНЫ, ШТО НЕХТА САЧЫЎ ЗА УЭЙНАМІ.

САВА ЗА ВАКНОМ ПАКІНУЛА НА МНЕ ПАЧУЦЦЁ СТРАХУ.

ЧЫМ БЛІЖЭЙ МЫ НАБЛІЖАЛІСЯ ДА ЗЯМЛІ, ЗАХАВАНУЮ ДЛЯ ШКОЛЫ, ТЫМ ЧУТНЕЙ Я СЛЫХАЎ ГЭТЫ ГЛУПЫ ВЕРШЫК.

ЧЫМ БЛІЖЭЙ МЫ НАБЛІЖАЛІСЯ ДА ГЭТАГА ЧОРТАВАГА СКРЫЖАВАННЯ...

SKREEEE-EE-EE

...НА ВУГЛУ ВУЛІЦ ЛІНКАЛЬН І МАРЧ.

ПАДЗЕННЕ ДОМА УЭЙНАЎ ЧАСТКА 2

WRITERS SCOTT SNYDER & JAMES TYNION IV
ART RAFAEL ALBUQUERQUE
COLORS DAVE McCAIG
LETTERS DEZI SIENTY
ASSISTANT EDITOR KATIE KUBERT
EDITOR MIKE MARTS
BATMAN CREATED BY BOB KANE

2012

працяг будзе...